УДК 81’115

# ВЕРАГОДНАСЦЬ РОЗНЫХ ТЫПАЎ ДЫСКУРСУ: ЛІНГВІСТЫЧНЫ І ЭКСТРАЛІНГВІСТЫЧНЫ АСПЕКТЫ

***А. А. Салавей,*** *выкладчык кафедры тэорыі і практыкі англійскага маўлення, МДЛУ*

*Рэзюмэ – у працы разглядаецца спецыфіка рэалізацыі катэгорыі верагоднасці ў публіцыстычным, навуковым і мастацкім дыскурсах. Атрыманыя вынікі могуць знайсці прымяненне ў выкладанні тэорыі міжкультурнай камунікацыі, кампаратыўнай стылістыцы, у лексікаграфічнай практыцы.*

*Resume – the work is concerned with the specific features of realization of credibility in publicistic, scientific and artistic discourses. The results obtained can find application in teaching the theory of intercultural communication, comparative stylistics, in lexicography.*

**Уводзіны.** Сярод антрапалагічных з’яў, што суправаджаюць жыццё і дзейнасць людзей, асобае месца займае верагоднасць – адзін з цэннасных складнікаў мадальнасці, феномен індывідуальнай і сацыяльнай свядомасці. Чалавек пастаянна сутыкаецца з разнастайнымі сітуацыямі, што патрабуе прыняцця рашэнняў пры недахопе вычарпальнай інфармацыі аб аб’екце ацэнкі, і афармляе свае думкі, эксплііцытна ці імпліцытна, з дапамогай моўных адзінак верагоднасці. У верагоднасці занатаваная арганізацыя працэсаў камунікатыўнага ўзаемадзеяння і ўздзеяння. Адначасова верагоднасць – фундаментальная катэгорыя мовы, філасофіі, логікі, псіхалогіі, вывучэнне якіх дазволіць глыбей асэнсаваць феномены, звязаныя з існаваннем і жыццядзейнасцю чалавека.

Мэта даследавання – раскрыць спецыфіку рэалізацыі верагоднасці ў публіцыстычным, навуковым і мастацкім дыскурсах. Матэрыялам для даследавання паслужылі 300 публіцыстычных, навуковых і мастацкіх тэкстаў на беларускай і англійскай мовах.

**Асноўная частка.** Крытэрыямі для параўнання публіцыстычных, навуковых рэцэнзій і кароткіх апавяданняў выступаюць іх агульныя прагматычныя функцыі – інфарматыўная і ацэначная, супараўнальны аб’ем. Гэтыя жанры ўспрымаюцца з пункту гледжання верагоднасці неадназначна, што пацвярджаецца вынікамі анкетавання, праведзенага сярод 300 студэнтаў, настаўнікаў школ і выкладчыкаў УВА. Пры гэтым было выяўлена, што публіцыстычныя тэксты ўспрымаюцца як адносна праўдзівыя (52 % рэспандэнтаў успрымаюць публіцыстычныя тэксты як верагодныя). Навуковыя тэксты лічацца верагоднымі (96 %), паколькі ўтрымліваюць рэальны свет, мастацкія валодаюць меншай ступенню праудзівасці (12 %), бо змяшчаюць звесткі пра рэальны і выдуманы сусветы.

Вынікі праведзенага сацыялагічнага даследавання сведчаць аб тым, што з пункту гледжання адрасата тэксты менавіта гэтых жанраў можна ўмоўна падзяліць на тры групы: «у большасці верагодныя» (навуковы дыскурс), «хутчэй неверагодныя» (мастацкі дыскурс) і «напалову верагодныя» (публіцыстычны дыскурс).

Верагоднасць – лінгвапрагматычная катэгорыя, якая адлюстроўвае ступень упэўненасці адрасанта ў прапазіцыі. Макраполе верагоднасці ствараюць палі праблематычнай, простай і катэгарычнай верагоднасці.

Для даследавання верагоднасці істотнай выступае ідэя ўзаемадзеяння і ўзаемазалежнасці яе семантычных і прагматычных параметраў. На гэта звяртаў увагу Ч. Пірс, калі ў XIX ст. падзяліў семіетыку на тры разделы: сінтактыку, семантыку і прагматыку. Згодна з Т. ван Дэйкам, прагматыка з'яўляецца неад'емным кампанентам лінгвістычнай тэорыі. У яе кампетэнцыю ўваходзіць выяўленне сістэм, што характарызуюць моўную форму, значэнне і дзейнасць [1, р. 96]. Ю. Д. Апрэсян пад прагматыкай разумее «замацаваныя ў моўнай адзінцы (лексеме, афіксе, грамеме, сінтаксічнай канструкцыі) адносіны адрасанта да: 1) рэчаіснасці, 2) зместу выказвання, 3) адрасата» [2, с. 7–14]. Прагматычны аспект катэгорыі верагоднасці заключаецца ў яе двухбаковым разглядзе: з пазіцыі адрасанта і адрасата. З пункту погляду адрасанта, верагоднасць звязана з паняццямі *шчырасць, веданне, меркаванне*. З пазіцыі адрасата, верагоднасць – вынік даверу атрыманай інфармацыі, абумоўлены экстралінгвістычнымі (рэпутацыя, аўтарытэт адрасанта) і лінгвістычнымі фактарамі (кваліфікацыя выказвання як ведання, меркавання з дапамогай моўных сродкаў).

На распаўсюджанасць рэпрэзентантаў верагоднасці ўплываюць і лінгвакультурныя асаблівасці адрасантаў. Выкарыстанне беларускіх і англійскіх мадальных адзінак з семантыкай праблематычнай верагоднасці ў ідэнтычных функцыях (ненавязванне суразмоўцу сваіх думак, павага да чужога пункту погляду, зніжэнне катэгарычнасці) указвае на талерантнасць, разважлівасць, бесканфліктнасць беларусаў і брытанцаў. Адрозненні назіраюцца ў працэнтнай колькасці эксплікатараў, што рэалізуюць пэўную функцыю. Англійскія тэксты ўтрымліваюць значна большую колькасць маркераў, здольных выконваць функцыю самааўтарызацыі, чым беларускія (27 % і 14 % адпаведна). Большая частотнасць беларускіх адзінак (44 %) у функцыі ўхілення адрасанта ад персанальнай адказнасці за праўдзівасць прапазіцыі ў параўнанні з англійскімі (4 %) ідэнтыфікуе згуртаванасць, салідарнасць, еднасць беларусаў.

**Заключэнне.** Такім чынам, верагоднасць з'яўляецца міжжанравай катэгорыяй, аднак спецыфіка яе рэалізацыі залежыць ад стылёвай накіраванасці і мовы тэксту, экстралінгвістычных умоў (аўтарскія інтэнцыі, аўтарытэт і рэпутацыя камунікантаў, іх менталітэт).

**ЛІТАРАТУРА**

1. Dijk, T. A. van. Studies in the pragmatics of discourse / T. A. van Dijk. – The Hague [etc.]: Mouton, 1981. – XII, 331 p.
2. Апресян, Ю. Д. Прагматическая информация для толкового словаря / Ю. Д. Апресян // Прагматика и проблемы интенсиональности: сб. науч. тр. / Акад. наук СССР, Ин-т языкознания, Проблем. группа «Логический анализ языка»; отв. ред. Н. Д. Арутюнова. – М., 1988. – С. 7–44.

УДК 37.03:78:00

# РОЛЬ МУЗЫКАЛЬНОГО ИСКУССТВА В ФОРМИРОВАНИИ ЛИЧНОСТИ

***Б. К. Свердлов,*** *аспирант ФПиПД, МГУ имени А. А. Кулешова*
Научный руководитель – Т. А. Старовойтова, канд. пед. наук, доцент

*Резюме – в публикации показана роль музыкального искусства в формировании личности. Обращается внимание на особенности созидательного воздействия музыки в течение всей жизни, на необходимость приобщения и понимания классических устоев, на выработку личностной завершенности и формирование правильного эстетического вкуса.*

*Resume – the publication shows the role of musical art in the formation of personality. Attention is drawn to the features of the creative impact of music throughout life, the need for initiation and understanding of classical foundations, the development of personal completeness and the formation of the right aesthetic taste.*

**Введение.** Искусство напрямую влияет на эстетическое восприятие личности, формируясь с раннего детства. Эта зависимость прослеживается потом на протяжении всей жизни, может видоизменяться на различных этапах взросления. Требуется тщательная инкрустация подаваемого материала, ведь процесс исторического и общественного развития необратим. В современном мире XXI века активно насаждается «субкультура», чрезмерное увлечение которой рискует затенить художественно ценные произведения. Искусственно создается мода на культурное и эстетическое восприятие молодежи. Сегодня, к сожалению, под видом глобализации размываются грани в идентичности каждого народа, теряются культурные различия, переписываются исторические эпохи, что заставляет терять свою национальную идентичность, а также культурно-исторические ценности.

**Основная часть.** Музыка в современном мире стала феноменом повседневности. Человек, не имеющий представлений о влиянии музыки на жизнь, не задумывается, насколько она может быть интерпредметна и многофункциональна, находясь в пространственной недосягаемости, и в то же время понятна во всем мире, хотя не имеет языкового барьера, а с появлением высокотехнологичных гаджетов способна распространяться на весь земной шар. Через влияние на сознание и подсознание как в профессио-